*Белакурская Ж.Я., Белакурскі В.М.*
*БДУКМ, Мінск*

# АСОБА ЯКУБА КОЛАСА Ў КАНТЭКСЦЕ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ

1. Цэласнае асэнсаванне феноменаў творчасці, творчай асобы на сённяшнім этапе развіцця грамадства і культуры з'яўляецца надзвычай актуальным як у філасофіі, псіхалогіі, літаратуразнаўстве, так і ў культуралогіі.

2. У працах вядомых даследчыкаў (М. Бахцін, Ю. Лотман, М. Мамардашвілі, Э. Ільенкаў і інш.) разглядаюцца праблемы сацыякультурнага статусу мастака, глыбінныя, унутраныя механізмы творчай дзейнасці, спецыфіка развіцця сусветнай мастацкай культуры.

3. Асаблівасці культуралагічнага падыходу да аналізу творчасці і творчай асобы заключаюцца найперш у тым, што ў ім рэалізуюцца прынцыпы адзінства, цэласнасці працэсу і выніку творчасці, працэсаў станаўленняў асобы і культуры.

Для суб'екта творчай дзейнасці гэта дае магчымасць вызначыць яго сацыяльную жыццядзейнасць як у якасці інфармацыйнага складніка жыцця соцыуму на пэўным часавым адрэзку, так і адначасова рэпрэзэнтаваць сябе як суб'екта творчасці, яго дзейнасць у сацыякультурным кантэксце ў цэлым.

4. Дынамічна ўвайшоўшы ў духоўнае і культурнае жыццё Беларусі ў пачатку XX стагоддзя, Якуб Колас сёння паўстае як аб'ект даследавання, феномен практычнай культуралогіі, знакавая фігура ў культурным жыцці нацыі.

У духоўна-маральных арыенцірах твораў Якуба Коласа праявілася ядро эстэтычнай культуры беларускага народа, што ўяўляе сабой непераходзячую цікавасць і для другіх сусветных культур: яно ўключае ў сябе сістэму рэгулятываў і інтэгратыўную характарыстыку яго ментальнасці. Гэта аб'ектыўна сфарміраваная якасць дае магчымасць Якубу Коласу ў сваіх творах гаварыць голасам сваёй нацыянальнай культуры, прадстаўляць духоўна-маральны і інтэлектуальны патэнцыял беларускага народа.

5. Сінтэтычная спадчына Якуба Коласа, якая бярэ пачатак з беларускай культурнай крыніцы, пераканаўча выражае беларускі культурны архетып і цывілізацыйна-культурны код Беларусі. «Творчасць Якуба Коласа прасякнута культуратворчымі і культуралагічнымі інтэнцыямі, якія набываюць форму мастацка-вобразнага спасціжэння культуры, арыентуюцца на звышпачуццёвы пачатак пазнання, уключаючы сюды асабістае разуменне, уласную пазіцыю [2, с.46].

6. Сваёй творчасцю Якуб Колас фарміруе і дэманструе ўласнае разуменне новых жыццёвых праблем, пластоў рэчаіснасці і характараў, якія адлюстроўваюць не толькі іх нацыянальна-гістарычную спецыфіку, але і агульныя аспекты цывілізацыйнай прыроды чалавека, нацыянальнага развіцця, цесна звязаныя з філасофска-эстэтычнымі, маральна-этычнымі і сацыяльнымі пытаннямі грамадства. Усё гэта дазваляе пранікнуць у базісна-сэнсавы ўзровень айчыннай культуры і сусветнай культуры ў цэлым.

7. У аснову літаратурнай творчасці Якуба Коласа пакладзена спрадвечная духоўнасць і традыцыйны менталітэт беларуса, яго імкненне да творчасці і самаўдасканалення.

Творы пісьменніка пабуджаюць да дыялогу, да актыўнага разумення, звязаных з рэфлексіяй і інтраспекцыяй. Дыялог сучаснага чытача з Якубам Коласам з'яўляецца не толькі формай і сродкам развіцця думкі. Гэта і аснова культуралагічнага асэнсавання і станаўлення духоўнай свядомасці чалавека як творчай асобы.

8. У публіцыстычнай і эпісталярнай спадчыне Якуба Коласа, яго вучэбна-метадычных дапаможніках «Другое чытанне для дзяцей беларусаў», «Методыка роднай мовы» знайшлі грунтоўнае асвятленне погляды пісьменніка на агульныя і прыватныя тэарэтычныя і лінгва-педагагічныя праблемы. У аснове іх – разуменне значэння мовы ў духоўным адраджэнні і фарміраванні нацыянальнай свядомасці, вызначэнне месца роднай мовы ў школьнай адукацыі.

Выказванні Якуба Коласа сведчаць пра эстэтычныя адносіны пісьменніка да мовы (г. зн. саму мову, у яе гукавай і пісьмовай форме, ён успрымаў як эстэтычны аб'ект). Літаратурныя творы, на думку пісьменніка, павінны выхоўваць густ да прыгожага, да паэзіі і мастацтва, выкладчык павінен быць «чалавек здольны, мастак», «справа выкладання ёсць мастацтва», якое «прыносіць вялікае эстэтычнае задавальненне» [1, с. 324–325].

9. Эрудыцыя Якуба Коласа, грунтоўная тэарэтычная база, лінгвістычны кругагляд праявіліся ў актыўнай і плённай рабоце над праектам беларускага правапісу (1930), працы ў тэрміналагічнай камісіі Інбелкульта, у арфаграфічнай камісіі па падрыхтоўцы змен і ўдакладненняў беларускага правапісу (1951), рэдагаванні руска-беларускага слоўніка (1953).

30 гадоў творчай дзейнасці пісьменніка звязаны з Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі, дзе ён займаў пасаду віцэ-прэзідэнта АН БССР.

На адной з сесій Агульнага сходу акадэміі быў заслуханы даклад Якуба Коласа «Развіццё культуры і навукі ў БССР за 30 год» (снежань 1949).

10. Такім чынам, арыентацыя на развіццё і захаванне культурнай самабытнаці беларускага народа, вызначэнне яго ролі ў стварэнні нацыянальна-духоўных каштоўнасцей беларусаў як этнасу знайшлі непасрэднае адлюстраванне ў культурна-асветніцкім кірунку творчасці пісьменніка ў цэлым.

**Літаратура**


1. Колас, Якуб. Методыка роднай мовы//Якуб Колас. Збор твораў: У 14 т. – Мінск: Маст.літ., 1976. – Т. 12. – 527 с.
2. Смолік, А. Культуралагічны дыскурс у беларускім коласазнаўстве//Каласавіны. Якуб Колас і яго сучаснікі: да вывучэння асабістых узаемасувязей пісьменніка: матэрыялы XXVI навук. канф., 4 лістапада 2011 г. – Мінск: Ковчег, 2012. – 368 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Бородина И.Н.*
*БГАИ, Минск*

## ХУДОЖЕСТВЕННОЕ РЕШЕНИЕ ДОКУМЕНТАЛЬНЫХ ФИЛЬМОВ М. ЖДАНОВСКОГО О МУЗЫКАНТАХ

Важное место в неигровом кинематографе занимают фильмы-портреты. Создавая их, режиссёр стремится раскрыть документального героя наиболее полно и точно. С экрана зритель, безусловно, воспринимает новую информацию, исходя из уже имеющихся у него знаний. Тем не менее новые экранные сведения могут в значительной мере дополнить или даже изменить существующие у зрителя представления. Кроме того, зачастую